15а
84096

Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі

КАТАЛОГ НАВУЧАЛЬНЫХ МОДУЛЯЎ

Пад рэдакцыяй
члена–карэспандэнта БелАА А. І. Жука

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 1996

Национальная библиотека Беларуси

ПРАДМОВА

Адной з важнейшых праблем арганізацыі працэсу павышэнн кваліфікацыі педагагічных работнікаў з'яўляецца праблема праектавані зместу курсавой падрыхтоўкі слухачоў, накіраванай на задавальненне адукацыйных патрэбнасцей і зняцце прафесіянальных цяжкасцей. У ІП праходзяць перападрыхтоўку і павышаюць кваліфікацыю звыш 50 катэгорь педагогаў і кіраўнікоў сістэмы адукацыі розных узроўняў. Гэта выклік сур'ёзныя цяжкасці структурных падраздзяленняў (дэканатаў, кафедраў), таксама выкладчыкаў і метадыстаў інстытута ў распрацоўцы вучэбнь планаў і праграм курсаў і па меры неабходнасці мяркуе навукову прапрацоўку інавацыйных падыходаў да праектавання зместу павышэнн кваліфікацыі.

Адным са шляхоў вырашэння названай праблемы, выяўленых у вынік тэарэтычных і вопытна–эксперыментальных пошукаў, з'яўляецца блочна модульны падыход.

У мэтах навукова–метадычнага забеспячэння планавання і вызначэнн аптымальнага зместу курсавой падрыхтоўкі слухачоў, уліку спецыфі розных груп спецыялістаў (адрозненні ў катэгорыях, прафесіянальны вопыце, патрэбах і цяжкасцях, тэрмінах і мэтах курсаў) кафедрамі інстытут распрацаваны навучальныя модулі ў рамках вучэбнага прадмета кожна кафедры, якія могуць быць прапанаваны адпаведным катэгорыям слухачоў.

Структура вучэбнага модуля ўключае, як правіла, базавы (інварыянтны блок зместу, які прапаноўваецца розным катэгорыям слухачоў і ўключа мінімальна неабходную, інавацыйную для іх інфармацыю, а таксама адзін і некалькі дадатковых блокаў рознага аб'ёму, якія пашыраюць і паглыбляюц змест інварыянтнага блока і ўлічваюць спецыфіку і патрэбы той ці іншай групы слухачоў. Змест навучальных модуляў кафедраў пастаянн абнаўляецца за кошт уключэння навейшых дасягненняў базавых навук, які ляжаць у аснове вучэбнага прадмета кафедраў, выкарыстання перадавог педагагічнага вопыту, вынікаў вопытна–эксперыментальнай работы базавы пляцовак інстытута і ўласнай навукова–пошукавай дзейнасці выкладчыкаў метадыстаў ІПК.

Прапанаваны падыход дае магчымасць рэалізаваць больш эфектыўны тэхналогіі фарміравання і адбору зместу павышэння кваліфікацыі, гэта значыць арганізаваць курсавую падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў на прынцыпова новай, блочна–модульнай аснове. Камбінаванае выкарыстанне распрацаваных кафедрамі інстытута навучальных модуляў дазваляе дэканатам факультэтаў, з аднаго боку, перспектыўна ажыццяўляць мэтанакіраваную распрацоўку (праектаванне) вучэбных планаў і праграм курсавой падрыхтоўкі слухачоў, улічваць іх адукацыйныя патрабаванні і цяжкасці ў прафесіянальнай практыцы, вар'іраваць працягласць і глыбіню прапрацоўкі таго або іншага вучэбнага зместу. З аднаго боку, наяўнасць "банка" навучальных модуляў дае магчымасць ствараць варыятыўныя вучэбныя планы для кожнай катэгорыі курсантаў і пры неабходнасці аператыўна карэкціраваць іх змест па ходу правядзення курсаў, пашыраючы ці скарачаючы адпаведныя блокі.

На падставе рэгулярна ажыццяўляемай дыягностыкі прафесійных цяжкасцей слухачоў і ў выніку пошукавай і вопытна–эксперыментальнай работы (1992—1995 гг.) супрацоўнікамі кафедраў распрацавана больш за 100 навучальных модуляў для розных катэгорый курсантаў, асноўныя з якіх прадстаўлены ў дадзеным каталогу. Выкарыстанне распрацаваных модуляў дае магчымасць ствараць гібкія праграмы навучання, якія улічваюць прафесійны вопыт, інтарэсы і патрэбнасці слухачоў. Гэта дасягаецца за кошт камплексавання блокаў рознай працягласці і аб'ёму ў іх розных спалучэннях. Прапанаваныя модулі ў залежнасці ад мэтавых установак (мэтапалагання) і канцэпцыі курсаў рэалізуюцца як у інфармацыйна–рэпрадуктыўных, так і аргдзейнасных, рэфлексіўна–мысліцельных формах. Шэраг інтэграваных модуляў з'яўляецца пазітыўным прыкладам кааператыўнай творчай дзейнасці выкладчыкаў розных кафедраў інстытута па распрацоўцы інавацыйнага зместу і калектыўна–мыследзейнасных тэхналогій іх рэалізацыі.

Комплекснае прымяненне распрацаваных модуляў накіравана на выкананне адной з асноўных функцый дзейнасці інстытута — аказанне адукацыйных паслуг педагагічным работнікам, накіраваных на падтрымку і ўдасканаленне існуючай практыкі адукацыі.

Наступны этап вопытна–эксперыментальнай дзейнасці кафедраў накіраваны на распрацоўку навукова– і вучэбна–метадычнага забеспячэння рэалізацыі ўказаных навучальных модуляў. Гэта мяркуе распрацоўку тэматыкі і зместу адпаведных тыпаў заняткаў (тэхналогій), уключаючы традыцыйныя лекцыйна–семінарскія формы, падрыхтоўку тэматыкі і праграм семінараў і курсавых работ слухачоў і спіскаў літаратуры, а таксама інавацыйных, актыўна–дзейнасных форм іх рэалізацыі.

А. І. Жук, рэктар Інстытута
павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі
кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ